УДК 811.161.3:378
І.У. Капцюг, дац., канд. філал. навук (ВА РБ, г. Мінск)

# СТРУКТУРНЫ ПАДЗЕЛ ПАБОЧНЫХ КАНСТРУКЦЫЙ

Тэма даследавання з’яўляецца актуальнай, таму што ў беларускім мовазнаўстве вывучэнне пабочных канструкцый пакуль не атрымала ўсебаковага асэнсавання. Пабочныя канструкцыі фрагментарна разглядаліся ў граматыках, у энцыклапедычных выданнях, у вучэбнай літаратуры [1–6]. Пабочнымі называюцца такія граматычна не звязаныя з членамі сказа канструкцыі (словы, спалучэнні слоў і сказы), якія служаць для выражэння адносін таго, хто гаворыць, да выказанай думкі. Пабочныя словы і спалучэнні слоў не з’яўляюцца членамі сказа: А пацярпець, вядома, трэба (Я. Колас); Між іншым, дзед жыў у адным з намі доме, праз сенцы (Б. Сачанка); Ці не паможаце ў бядзе, так сказаць? (В. Быкаў).

Па структуры пабочныя канструкцыі падзяляюцца даследчыкамі на пабочныя словы, спалучэнні слоў і сказы. Па суадноснасці з пэўнымі часцінамі мовы **пабочныя словы** падзяляюцца на два тыпы – іменны і дзеяслоўны. У склад іменнага тыпу ўваходзяць пабочныя словы, якія па форме суадносяцца са склонавымі формамі назоўнікаў, прыметнікаў, а таксама з рознымі групамі прыслоўяў: Можа б і пералез як, але, на бяду, трэба было якраз выйсці на двор яго брату! (Я. Колас); Галоўнае, у нас заставалася яшчэ вольная гадзіна, і мы маглі нагаварыцца ўволю (В. Карамазаў); Дарэчы, Алена, як ваша імя па бацьку? (Т. Барысік); Па-першае, ён ніколі не рабіў падключэння, а па-другое, хоць тэарэтычна ведаў усё, але вымушаны быў прызнацца сабе: Богдан намнога вопытнейшы за яго (В. Супрунчук). Пабочныя словы дзеяслоўнага тыпу граматычна нагадваюць сабой розныя віды аднасастаўных сказаў: Бабо, вайна, кажуць, будзе? (Я. Брыль); Во, панота, ён ужо, бачыце, хлеба есці не хоча, – зазлавала грыбніца (Я. Сіпакоў); І цвітуць над шатрамі надзеі, і бурліць жыццё, і, здараецца, нават песні чуеш, што плывуць-выплываюць з-пад белых шатроў (М. Лынькоў). Такім чынам, марфалагічнымі асаблівасцямі пабочных слоў з’яўляюцца: па-першае, суадноснасць іх з рознымі часцінамі мовы; па-другое, адсутнасць форм змянення; па-трэцяе, утварэнне імі асобнай лексіка-граматычнай групы, якая адрозніваецца ад іншых катэгорый слоў паводле свайго марфалагічнага складу, сэнсавага значэння, сінтаксічнага ўжывання і інтанацыйнага гучання.

Пад **пабочнымі спалучэннямі слоў** разумеюцца граматычна аформленыя два (і больш) знамянальныя словы, якія служаць для выражэння мадальнага, эмацыянальнага і экспрэсіўнага значэнняў

зместу сказа. Яны ўтвараюцца на базе аб'яднання паўназначных слоў, з якіх адно з'яўляецца дамінантным, асноўным, а другое – залежным ад яго. Паводле граматычнай прыроды дамінантнага слова пабочныя спалучэнні слоў бываюць трох тыпаў: іменныя, дзеяслоўныя і спалучэнні пабочных слоў з прыслоўямі, займеннікамі, злучнікамі.

Пабочныя спалучэнні іменнага тыпу вельмі прадуктыўныя. Шырокае распаўсюджанне ў мове атрымалі спалучэнні склонавых форм назоўнікаў: Пайду і паспрабую, у выпадку чаго, пазмагацца (Ц. Гартны); На іх бяду, авёс быў малы, толькі што выплыў (Я. Колас); Я сягоння абраў новае лежа для спання: на маё шчасце, забыліся будку сабачую раскідаць, дык на месца Лыскі нашага я з вамі, малыя, пасялюся (Я. Купала). Невялікую групу складаюць пабочныя беспрыназоўнікавыя спалучэнні слоў: Фізічная патрэбнасць жыць, ці, іншымі словамі, жывёльная прага жыцця (В. Казько); У кожным разе вайна, галоўным чынам, б'е па нас (Ц. Гартны); Адным словам, перспектыву яна вымалявала перада мною простую, як усё геніяльнае, надзейную і выгодную з усіх бакоў (А. Крэйдзіч).

**Пабочнымі** называюцца **сказы**, уключаныя ў іншы сказ, але не звязаныя спалучальнай ці падпарадкавальнай сувяззю ні з адным з яго членаў. Значэнне пабочных сказаў адпавядае значэнню пабочных слоў: яны могуць указваць на пэўнасць ці няпэўнасць паведамлення, заключанага ў асноўным сказе, даваць яму эмацыянальную ацэнку, характарызаваць стыль, вызначаць экспрэсію маўлення, указваць на суадносіны паміж асобнымі часткамі выказвання ці выражаць розныя заклікі да субяседніка. Супастаўленне пабочных слоў, спалучэнняў слоў і сказаў сведчыць аб тым, што рэзкіх межаў паміж імі няма. Гэтае супастаўленне яшчэ раз пацвярджае наяўнасць пераходных з'яў у сінтаксісе. Асабліва паказальныя ў гэтым плане аманімічныя сінтаксічныя канструкцыі, якія адрозніваюцца толькі функцыянальна. Параўн.: Вядома, што чалавек ён выхаваны (вядома – галоўная частка складаназалежнага сказа). – Вядома, чалавек ён выхаваны (вядома – пабочны сказ). – Ён, вядома, чалавек выхаваны (вядома – пабочнае слова). Характэрнымі прыметамі, якія адрозніваюць пабочныя сказы ад пабочных слоў і спалучэнняў слоў, з'яўляюцца большая канкрэтнасць іх зместу і адносная сэнсавая закончанасць.

У якасці пабочных сказаў могуць выступаць: 1) двухсастаўныя асабовыя сказы: Як гавораць старыя людзі, летні дзень год корміць (З. Бядуля); Зіма, як паведамляюць метэаролагі, заўсёды прыходзіць у маю вобласць раней, чым куды, яна багацейшая там на снег і больш сярдзітая сваімі маразамі (Я. Сіпакоў); 2) аднасастаўныя пэўна-асабовыя сказы: Цяпер, скажу вам, наўрад ці вы знойдзеце такіх

дужых людзей (М. Гарэцкі); А Мікола, мяркую, усё дараваў бы табе, калі б папрасіла (С. Бязлепкіна); 3) аднасастаўныя няпэўна-асабовыя сказы: Што ж, як кажуць, дыму без агню не бывае (А. Якімовіч); Гара, як нам паведамілі, называецца Маладзецкім курганам (Я. Брыль); 4) аднасастаўныя безасабовыя і інфінітыўныя сказы: Хмары, здавалася, паважчэлі і насунуліся ніжэй (І. Мележ); Міхал, сказаць, крыху баяўся (Я. Колас); Зіма, трэба думаць, неўзбаве саступіць месца вясне (Б. Мікуліч). Пабочныя сказы ўключаюцца ў асноўны сказ як без злучнікаў, так і пры дапамозе злучнікаў і злучальных слоў: У той дзень у яе дачкі дакапалі бульбу, і, як звычайна робіцца ў нашых гасцінных вёсках, вечарамі ў хаце загудзела застолле (Я. Сіпакоў); А бацька яго, як ён думаў, мае права і павінен рабіць усё, што яму, Сержу, захочацца (К. Чорны).

Такім чынам, пабочныя словы, спалучэнні слоў і сказы адрозніваюцца па колькасці элементаў, якія ўваходзяць у склад канструкцый, пабочныя словы і спалучэнні слоў бываюць іменнага і дзеяслоўнага тыпу. Навуковаму і афіцыйна-дзелавому стылям уласцівы пабочныя канструкцыі, якія выражаюць лагічныя сувязі і адносіны паміж часткамі сказа, указваюць на паслядоўнасць выкладу думак. У мастацкіх творах пашыраны ўсе тыпы пабочных канструкцый, яны часта ўжываюцца ў мове дзеючых асоб, дзе назіраюцца пераходы ад адной думкі да іншай, нейкія заўвагі, асацыяцыі.

## ЛІТАРАТУРА


1. Аўласевіч, М. А. Пабочныя канструкцыі / М. А. Аўласевіч // Беларуская мова : энцыклапедыя / пад рэд. А. Я. Міхневіча ; рэдкал.: Б. І. Сачанка (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 1994. – С. 396–397.
2. Беларуская граматыка : у 2 ч. / АН БССР, Ін-т мовазнаўства ; рэд. М. В. Бірыла, П. П. Шуба. – Мінск : Навука і тэхніка, 1986. – Ч. 2 : Сінтаксіс. – 327 с.
3. Граматыка беларускай мовы : у 2 т. / АН БССР, Ін-т мовазнаўства ; рэд. К. К. Атраховіч, Г. М. Булахаў, П. П. Шуба. – Мінск : Навука і тэхніка, 1966. – Т. 2 : Сінтаксіс. – 756 с.
4. Кароткая граматыка беларускай мовы : у 2 ч. / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т мовазнаўства ; навук. рэд. А. А. Лукашанец. – Мінск : Беларус. навука, 2009. – Ч. 2 : Сінтаксіс. – 240 с.
5. Сучасная беларуская мова : вучэб. дапам. / пад агул. рэд. Л. М. Грыгор’евай. – 3-е выд, выпр. – Мінск : Выш. шк., 2010. – 622 с.
6. Яўневіч, М. С. Сінтаксіс сучаснай беларускай мовы : вучэб. дапам. / М. С. Яўневіч, П. У. Сцяцко. – 3-е выд., дапрац. – Мінск : Выш. шк., 1987. – 272 с.